# *УСЁ НАПЕРАДЗЕ*



**Пралог можна назваць самым аптымістычным з элементаў кампазіцыі твора. Часта менавіта з яго пачынаецца аповед. Менавіта з вывучэння пралогу (тэма «Кампазіцыя твора. Пралог») у Гродзенскай грамадскай літаратурнай школе пачалося паэтапнае знаёмства з усімі элементамі кампазіцыі. Створаны абласной пісьменніцкай арганізацыяй грамадска-адукацыйны праект нагадаў пра сябе 18 студзеня.**

У першым занятку 2024 года прынялі ўдзел прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі – старшыня ГрАА СПБ Л. А. Кебіч; паэт, публіцыст, літаратурны крытык Д. М. Радзівончык, а таксама нашы даўнія сябры і калегі – прадстаўнікі Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб'яднання «Надзея» (кіраўнік паэтэса Святлана Глембоцкая); іншыя аматары прыгожага пісьменства, зацікаўленыя (часам іх называюць апантанымі) літаратурнай творчасцю.

У ходзе вялікага тэарэтычнага ўступлення мы пазнаёміліся з пралогам бліжэй: даведаліся пра тое, што прынята называць пралогам, як гэты тэрмін перакладаецца са старажытнагрэцкай мовы, пералічылі асноўныя тыпы пралогу і іх функцыі, разгледзелі плюсы і недахопы пралогаў, іх адрозненні ад іншых элементаў кампазіцыі, паспрабавалі ўразумець – калі пралог патрэбен аўтару, а калі можна абысціся без яго, пазнаёміліся з інструкцыямі – як напісаць добры пралог і нават ацанілі некаторыя прыклады пралогу (не толькі з літаратуры).

Пасля незапланаванага дыскусійнага блока, які стаў на нашых занятках традыцыйным, было вырашана, сабраўшы волю ў кулак, перайсці да практыкі. Як заўсёды, да напісання экспромтаў былі гатовыя не ўсе са слухачоў. Аднак, гэтая акалічнасць не перашкодзіла калегам паўдзельнічаць, і даволі пераканаўча, у наступным, аналітычным блоку. Самым складаным аказалася вылучаць пралогі ў мастацкіх тэкстах, асабліва ў лірыцы, класіфікаваць іх, апісваць іх функцыі, адрозніваць пралог ад падобнага элемента кампазіцыі – экспазіцыі. Падчас сустрэчы стала зразумела, што яшчэ больш даведацца пра пралог можна будзе падчас наступнага занятку, прысвечанага вывучэнню менавіта гэтага, суседняга з пралогам элементу кампазіцыі. Самымі актыўнымі ўдзельнікамі занятку сталі публіцыст-гісторык А. М. Радзівонаў (Аляксандр Мікалаевіч уносіў пазнавальна-гумарыстычныя ноткі ў нашу сур'ёзную гутарку) і паэтэса Алена Шаламіцкая (Лена традыцыйна гатовая дзяліцца з калегамі каштоўнымі ведамі па тэме з уласнага творчага і жыццёвага вопыту). Недахопам сустрэчы таксама па



традыцыі, але прыкрай і крыўднай, стала поўнае грэбаванне праектам з боку калектыву Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. І вельмі шкада. Як паказваюць прадстаўленыя ў зборнікі і альманахі тэксты, іх якасць, тэхнічны бок аўтарскіх творчых рашэнняў яшчэ ёсць куды паляпшаць. І самы эфектыўны для гэтага сродак – асвежаныя ў памяці або атрыманыя ў ходзе сумесных заняткаў веды.

Пралог можна разглядаць таксама ў больш шырокім сэнсе, як філасофскую катэгорыю. Напрыклад, папярэдні занятак нашай літшколы (з аглядам усіх элементаў кампазіцыі мастацкага тэксту) таксама можна па праве назваць пралогам – да цыклу заняткаў, аб'яднаных адной тэмай «Кампазіцыя твора». Мяркуючы па колькасці аўтарскіх кніг нашых калег па грамадскай літаратурнай школе, па колькасці іх перамог на разнастайных конкурсах, удзел у гэтым грамадска-адукацыйным творчым праекце таксама можна разглядаць у якасці своеасаблівага пралогу да нечага вялікага і шчаслівага.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На здымках:** Гродзенская грамадская літаратурная школа ў другі раз пачала вывучэнне кампазіцыі літаратурнага твора, але ўжо не з агляду ўсіх яе элементаў, а з даследвання аднаго канкрэтнага элемента (тэма «Кампазіцыя твора. Пралог»). Гродзенскі офіс Саюза пісьменнікаў Беларусі, 18 студзеня 2024 года.
























